МІНІСТЭРСТВА ТРАНСПАРТУ І КАМУНІКАЦЫЙ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ
ДЭПАРТАМЕНТ ПА АВІЯЦЫІ
**Рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства**
**«НАЦЫЯНАЛЬНЫ АЭРАПОРТ МІНСК»**
тэр. Нацыянальнага аэрапорта «Мінск», 220054, г. Мінск
УНП 600048566, АКПА 011298885000
Тэл.: (017) 279 18 38, факс: (017) 279 17 68
Сайт: www.airport.by E-mail: info@airport.by
Р/рахунак №3012158320013 у філіяле №514 ААТ «ААБ Беларусбанк», г. Мінск, вул. Сурганава, 47а, БІК 153001614

МИНИСТЕРСТВО ТРАНСПОРТА И КОММУНИКАЦИЙ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ
ДЕПАРТАМЕНТ ПО АВИАЦИИ
**Республиканское унитарное предприятие**
**«НАЦИОНАЛЬНЫЙ АЭРОПОРТ МИНСК»**
тер. Национального аэропорта «Минск», 220054, г. Минск
УНП 600048566, ОКПО 011298885000
Тел.: (017) 279 18 38, факс: (017) 279 17 68
Сайт: www.airport.by E-mail: info@airport.by
Р/счет №3012158320013 в филиале №514 ОАО «АСБ Беларусбанк», г. Минск, ул. Сурганова, 47а, БИК 153001614

30.08.2016 № 33-10-1783/з

на № ________ ад ________

Пра беларускую мову

Паважаны !

У адказ на Ваш электронны ліст ад 19.08.2016 г. у чарговы раз паведамляем, што ў сваёй дзейнасці па абслугоўванні пасажыраў і гасцей аэрапорта наша прадпрыемства цалкам кіруецца Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь (арт.17), Законам Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1990 г. № 3094-XI "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" (арт.13), правіламі і стандартамі Міжнароднай арганізацыі грамадзянскай авіяцыі (ICAO), распаўсюджанай практыкай дзейнасці іншых міжнародных аэрапортаў.

Хацелася б адзначыць, што непасрэдна само існуючае заканадаўства Рэспублікі Беларусь пакідае права выбару ў пытанні моўнай палітыкі за прадпрыемствам і яго кіраўніцтвам. У прыватнасці, артыкул 13 "Мова ў сферы абслугоўвання" Закона Рэспублікі Беларусь ад 26.01.1990 г. № 3094-XI "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" абвяшчае: "На транспарце, у гандлі, у сферы медыцынскага і бытавога абслугоўвання ўжываецца беларуская або руская мовы, а пры неабходнасці - іншыя мовы ".

РУП "Нацыянальны аэрапорт Мінск" з'яўляецца ў першую чаргу міжнародным авіятранспартным вузлом, які абслугоўвае пасажыраў 15-ці авіякампаній. Больш за 50% пасажырапатоку ў сапраўдны момант прыходзіцца на рэйсы ў краіны СНД, дзе асноўнай мовай міжнацыянальных зносін з'яўляецца руская. Як сэрвіснае

прадпрыемства РУП "Нацыянальны аэрапорт Мінск" павінна ў першую чаргу ўлічваць інтарэсы большасці пасажыраў.

Зыходзячы з вышэй сказанага, у бліжэйшы час даданне трэцяй мовы ў навігацыйную сістэму інфармавання пасажыраў не плануецца.

З павагай,
намеснік генеральнага дырэктара
па агульных пытаннях і працы з персаналам В.У. Палей

33 Караблікаў А. І.
279 25 53; +375 33 901 74 07